# Быццам анёл праляцеў…

## Лёс і загадка цудатворнай іконы Божай Маці Бялыніцкай



**У найбагацейшай духоўна-культурнай спадчыне нашага народа асаблівае месца займаюць абразы. Яны быццам акно ў неба, дапамагаюць нам спасцігнуць сэнс чалавечага існавання, дакрануцца да вечных каштоўнасцей. Пра адзін з такіх рарытэтаў, які захоўваецца ў музеі старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Акадэміі навук, – наш расказ.**

### Фарбы і лініі

Дзверы гэтага не зусім звычайнага ў нашым разуменні музея адчынены для ўсіх ахвотных. Але найчасцей заглядваюць сюды тыя, хто мае дачыненне да ведаў і навукі: вучоныя, аспіранты, магістранты, студэнты і школьнікі, зрэдку замежныя госці.

Чым жа адметны музей? У першую чаргу ён навукова-даследчы. Больш як сорак гадоў супрацоўнікі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору прывозілі артэфакты з экспедыцый па Беларусі, ствараючы для нас непаўторную мазаіку ўяўленняў пра жыццё продкаў.

Некалі ўсе экспанаты змяшчаліся ў адным пакоі, а цяпер нават анфілады з сямі памяшканняў бракуе. Рарытэтаў назбіралі амаль трыццаць тысяч (!), і ўсе маюць гістарычную і навуковую каштоўнасць. Вось драўляныя чоўны XII і XV стагоддзяў, у якіх сплаўляліся па Прыпяці альбо Нёмане. Ці выявы драконаў на кафлі XV стагоддзя, старадаўнія ўбор нявесты і святочная вопратка, рэчы сялянскага побыту і дзівоснай афарбоўкі люстэрка, багата інкруставаная старасвецкая мэбля – усё тут дыхае гісторыяй, заваражвае.

Але наш інтарэс сёння – іконы, дакладней, адна з іх.

– Гэта феномен культуры: канон, сімвалізм і сучасная графіка, – падкрэслівае дырэктар музея кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт Барыс Лазука. – Акно з нашага свету ў іншы – высокі, нябесны. Так бы мовіць, Божае прасвятленне ў фарбах і лініях.

Быццам пацвярджаючы свае словы, Лазука звяртае нашу ўвагу на абраз, які нібы магнітам прыцягвае да сябе незвычайнай свежасцю і яркасцю фарбаў у выяве лікаў.




Дырэктар музея старажытнабеларускай культуры Барыс Лазука: у фондах музея захоўваецца нямала рарытэтаў, якія чакаюць рэстаўрацыі

– Гэта цудатворная ікона Маці Божай Бялыніцкай. Яна з’яўляецца агульнай святыняй хрысціян Беларусі, – расказвае дырэктар музея. – Належыць да тыпу Адзігітрый: мы бачым выяву Багародзіцы з дзіцем на левай руцэ. Характэрная рыса – становішча правай рукі, апушчанай уніз да самага краю нібы пад цяжарам скіпетра. У вобліку Марыі традыцыйны іканапісны звод спалучаны з прыгожымі рысамі рэнесансснага жывапісу эпохі Адраджэння, а маленькі Ісус нагадвае хлопчыка з карцін італьянскіх мастакоў.

*«У цёплых промнях вачэй Божай Маці ажывае кожнае людское сэрца».*

Аднак нягледзячы на высокае мастацкае ўвасабленне, гэта ўсё ж не арыгінал, а копія XVII стагоддзя. Але адна з найлепшых і найбольш блізкая да арыгіналу, сцвярджае Лазука. Ікону выпадкова (цуд, няйначай!) знайшлі на пачатку 1980-х у вёсцы Сноў Нясвіжскага раёна. На вясковых могілках там з даўніх часоў стаяла закінутая каплічка, ужо і дах струхлеў, працякаў. За паўразбуранай печкай, у дровах ляжала ікона Маці Божай Бялыніцкай. Палатно мела шматлікія пашкоджанні, але на дзіва выявы святых час быццам не закрануў. Тым не менш рэстаўратару Аляксею Пуцінцаву давялося больш як год карпець над знаходкай, каб уратаваць шэдэўр.

– Затое цяпер у цёплых промнях вачэй Божай Маці ажывае кожнае людское сэрца, – усміхаецца Барыс Лазука.

Існуе некалькі паданняў, праваслаўнае і каталіцкае, звязаных з гісторыяй абраза. Каталіцкія вернікі ўпэўнены, што ікону Маці Божай Бялыніцкай напісаў анёл, які пад выглядам пілігрыма з’явіўся ў Бялыніцкім кармеліцкім кляштары неўзабаве пасля пабудовы яго ў 1624 годзе.

За сорак гадоў рэстаўратар Аляксей Пуцінцаў аднавіў больш як тысячу абразоў



Паводле праваслаўнага падання, ікону прынеслі чацвёра манахаў са славутай Кіева-Пячэрскай лаўры. Яны ўратавалі старажытны абраз візантыйскага пісання ад татарскага войска Батыя, што спустошала Кіеў і знішчала хрысціянскія святыні. Манахі і заснавалі тут царкву і мужчынскі манастыр.

Калі верыць легендзе, у першую ж ноч на абраным манахамі месцы на ўзвышшы ля ракі Друць – правым прытоку Дняпра, куды яны дабраліся на чоўне, вяслуючы супраць цячэння, здарыўся цуд. Ад аблічча Багародзіцы на іконе пачало сыходзіць дзівоснае ззянне, якое рассеяла цемру і ад якога прачнуліся стомленыя цяжкай дарогай уцекачы-вандроўнікі з Кіева. Яны палічылі гэта знакам, што Маці Божая тут пажадала ўсталяваць свой «пасад ласкі». Кажуць, што белыя ночы над Друццю «замацавалі» за мястэчкам назву Бялынічы, а мясцовыя жыхары тады імкнуліся будаваць сваё жытло як мага бліжэй да ўзгорка Марыі.



**Алтарную кампазіцыю ў музеі ўпрыгожваюць абразы XVI і XVII стагоддзяў**

***«Бясконцая любоў беларуса да жыцця – вось што найперш бачым у іканапісных творах».***

Што яшчэ цікавага ў гэтай фантастычнай гісторыі? У 1624 годзе ўладальнік Бялыніч Казімір Сапега ўпрыгожыў аклад іконы каштоўнымі камянямі. Недзе праз дзесяць гадоў здарыўся пажар і абраз перанеслі ў касцёл кармелітаў. Падчас вайны Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай ікона апынулася ў Ляхавіцкім замку, затым яе зноў вярнулі ў Бялынічы. А ў 1761 годзе абраз каранавалі. Паводле каталіцкай традыцыі гэта значыць, што яго афіцыйна прызналі цудатворным. Бялынічы ў XVIII–XIX стагоддзях заканамерна становяцца месцам паломніцтва вернікаў хрысціянскіх канфесій, якія дабіраліся сюды з самых далёкіх ваколіц. Мястэчка атрымала і сваю другую, неафіцыйную назву – беларускае Чанстахова, вельмі ўжо яно асацыявалася з галоўным духоўным цэнтрам і месцам паломніцтва, звязаным з Чанстахоўскай іконай Багародзіцы.

Што да іншых цікавостак, дык у 1876 годзе, калі Бялынічы былі ўжо ў складзе Расійскай імперыі, касцёл пра просьбе праваслаўных вернікаў (а яны ў мястэчку складалі большасць) пераасвяцілі ў сабор Нараджэння Прасвятой Багародзіцы. Ікону Маці Божай Бялыніцкай вельмі шанавалі ў той час, пра што сведчыць такі факт: на лета яе хрэсным ходам урачыста пераносілі ў Магілёў, каб як мага больш вернікаў маглі пакланіцца ёй.

З пачаткам рэвалюцыйных падзей, вядома ж, гэта традыцыя перастала існаваць. А ікона ў віхуры пераломных падзей… знікла. Дакладных звестак пра яе далейшы лёс няма. Паводле Барыса Лазукі, даследчыкі мяркуюць, што пасля таго як бялыніцкую царкву ў сярэдзіне 1920-х закрылі, абраз перадалі ў Магілёўскі абласны краязнаўчы музей. Тут ён захоўваўся разам з яшчэ адной святыняй Беларусі – Крыжам Ефрасінні Полацкай. Сляды каштоўных рарытэтаў губляюцца ў 1941 годзе, на самым пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Але было створана нямала высокамастацкіх жывапісных спісаў (копій) цудатворнага абраза Маці Божай Бялыніцкай. Гэта сведчыць пра тое, што беларусы вельмі шанавалі гэту ікону, бачылі ў Найсвяцейшай Багародзіцы сваю заступніцу ад ліхіх людзей і абставін. Яны маліліся перад абразом аб збаўленні ад хвароб і шукалі суцяшэння ў смутку.

– Знойдзены мінімум дзясятак спісаў, – расказвае Барыс Лазука. – Копіі абраза, што дайшлі да нашага часу з-пад Нясвіжа, Мядзела, Глыбокага, Вільнюса, Ліды і іншых месцаў, сведчаць: вядомасць гэтай цудатворнай святыні і яе шанаванне выходзіла далёка за межы Магілёўшчыны, дасягаючы Вільні, Варшавы і Кракава.

Дырэктар музея падкрэслівае, што ікону гэту і сёння шануюць праваслаўныя, каталікі і уніяты. На яго думку, беларусы рознага веравызнання аднолькава жывуць высокімі хрысціянскімі ідэаламі дабрыні, міласэрнасці і цнатлівасці.



Шанаваныя спісы цудатворнага абраза захоўваюцца ў многіх храмах Беларусі, у тым ліку, зразумела, і ў новым у Бялынічах, які ў 2005 годзе асвяцілі ў гонар Бялыніцкай іконы Божай Маці. Штогод 25 красавіка адбываецца святкаванне. Абраз нават увасоблены на гербе горада. У Дзень беларускага пісьменства ў 2020 годзе тут урачыста адкрылі скульптурную кампазіцыю: бронзавую ікону Маці Божай Бялыніцкай у абдымках трымае гранітны анёл, крылы якога ў стылі беларускай выцінанкі.

Такая своеасаблівая адсылка ў сівую даўніну, калі невядомы мастак напісаў абраз, у нябесную сілу якога верацъ і сучаснікі.

Ёсць нямала сведчанняў, што ікона валодае цудадзейнымі ўласцівасцямі. Паводле некаторых архіўных звестак, у XVIII–XIX стагоддзях існавала нават адмысловая кніга, у якой фіксавалі незвычайныя з'вы і факты, што звязвалі з абразом Маці Божай Бялыніцкай.

Кажуць, што музейная копія – адна з тых, якія валодаюць велізарнай невытлумачальнай сілай. Святары шмат разоў прасілі перадаць ікону ў храм.



Скульптурная кампазіцыя «З'яўленне іконы» ў гонар іконы Божай Маці Бялыніцкай упрыгожвае плошчу каля царквы ў Бялынічах. Аўтар – Аляксандр Мінькоў

Але не, усё ж такі вырашылі, што каштоўны артэфакт мае вялікае значэнне як часцінка нашай гісторыі, сімвал духоўнага жыцця беларусаў, таму месца ёй у выставачнай прасторы. Да таго ж цяпер яна незаменны элемент алтарнай кампазіцыі рэдкіх абразоў XVI і XVII стагоддзяў, якую ствараюць у музеі падчас рэканструкцыі.



– Пачуеце і галасы званоў, – інтрыгуе Барыс Лазука. – У нашых музеях наведвальнікам звычайна не хапае тактыльных адчуванняў. А тут можна самому пазваніць у званы. Мы назбіралі іх недзе каля дзвюх соцен, іх адлівалі ў свой час у людвісарнях, майстэрнях па вытворчасці званоў і гармат, на Брэстчыне і Гродзеншчыне. Таму

цяперашняя экспазіцыя з 20 прадметаў, натуральна, будзе папаўняцца.

У планах – наладзіць канцэрты званоў наўпрост у выставачнай зале. Бо пэўны вопыт «гастроляў» ужо ёсць – на свяце горада ў Мінску і іншых масавых мерапрыемствах, таму лагічна такую практыку наладзіць і ў самім музеі.

Што да абразоў, то ў абноўленай экспазіцыі іх каля дваццаці – сапраўдных узораў беларускага іканапісу.

На думку нашага суразмоўцы, захаванне сакральнага мастацтва – гэта не проста выратаванне пэўных прадметаў, але і душы, светапогляду чалавека. Бо духоўная гісторыя Беларусі, праходзячы скрозь час, натхняе на добрыя справы і ўчынкі.

***«Еднасць, адзінства, памяць звязаны з іншымі, не менш значнымі катэгорыямі, без якіх цяжка ўявіць цывілізаванага чалавека, – такімі як вера і годнасць».***

– Іканапіс – вялікая плынь нашай культуры, – гаворыць Барыс Лазука. – Знаёмства з абразамі XV–XVIII стагоддзяў, роздум над асаблівасцямі беларускай іканапіснай школы, апроч уласна эстэтычнай асалоды і духоўнага ўздыму, дае найбагацейшую глебу для разважанняў пра наш характар і менталітэт. Бясконцая любоў беларуса да жыцця – вось што найперш бачым у іканапісных творах.

Неяк у музей старажытнабеларускай культуры завіталі вучні сталічнай школы. Дзеці напрыканцы экскурсіі ўжо стаміліся, і Лазука вырашыў іх крыху расшавяліць.

– Ці верыце вы ў цуд? – спытаў ён. – Вы стаіце перад абразом Маці Божай Бялыніцкай, які лічыцца цудатворным. Ікона светлая, эмацыянальная, загадкавая, з няпростым лёсам. Каб нешта збылося, папрасіць трэба шчыра, ад усяго сэрца. Адчуць святло дабрыні і ў сваю чаргу пажадаць дабра. Для сябе, сваіх родных і сяброў, для нашай зямлі.

Барыс Андрэевіч згадвае, што неяк раптоўна стала зусім ціха – толькі ласкавы, амаль неадчувальны подых паветра. Быццам анёл праляцеў…

## Дакрануцца да цуду

Як вядома, айчынная сакральная спадчына перажыла цяжкія выпрабаванні. Многія іканапісныя шэдэўры падчас агрэсіўнага атэізму беззваротна страчаны. Вернікі ратавалі абразы як маглі: бралі дадому, хавалі. Дзе толькі не знаходзілі іх даследчыкі! У амаль разбураных храмах, на гарышчах і ў каплічках на вясковых могілках. Найчасцей толькі дзякуючы музейным рэстаўратарам удалося захаваць пашкоджаныя часам і людзьмі шэдэўры іканапапіснай культуры. Іх праца цяжкая і складаная, працэс аднаўлення аднаго абраза займае ад года да трох. Напрыклад, плашчаніца, знойдзеная падчас экспедыцыі ў вёсцы Вавулічы Драгічынскага раёна, выглядала зусім гаротна: як скрутак брудных ануч. Рэстаўратар Анжаліка Міцкевіч літаральна па малюсенькіх кавалачках, часам і па нітачцы, збірала яе аксамітную аснову. З нуля давялося аднавіць толькі адзін элемент гэтага кананічнага прадмета – карону над галавой Хрыста. Цяпер плашчаніца – адзін з цэнтральных экспанатаў музея старажытнабеларускай культуры.

Падчас рэстаўрацыйных работ высвятляецца нямала таямніц, што тояць іканапісныя творы. Некаторыя з іх не адзін раз перапісваліся ці дапаўняліся на адным і тым жа палатне. Адкрыць папярэдні малюнак рэстаўратарам дапамагае рэнтген. Часам пад бачным слоем на іконе XVIII стагоддзя ўдаецца «разгледзець» выяву, створаную раней на цэлае стагоддзе.

У музейнай рэстаўрацыйнай майстэрні працуюць чатыры спецыялісты. За год удаецца аднавіць тры іконы, для гэтага прадугледжаны пэўны аб'ём фінансавання. Не дзіва, што сваёй чаргі знойдзеныя артэфакты чакаюць па 10–15 гадоў. Для некаторых з іх «часовая кансервацыя» зацягнулася амаль на ўсе трыццаць.

Кожны вернуты з нябыту, адноўлены абраз робіць сваю добрую справу, лічыць Барыс Лазука.

– Калі трымаць веру ў сваім сэрцы, кіравацца традыцыямі нашых продкаў, якія заўжды прасілі добрага лёсу сваім нашчадкам, ніколі не забывалі пра старых і тых, каму патрэбна дапамога, тады

Наведвальнікаў Вялікага тэатра Беларусі ўзрушыла незвычайная сустрэча з бясцэннымі іконамі. 2022 год



і грамадства на гэтай грунтоўнай аснове будзе аб'яднаным адзінымі намаганнямі, каб павольна, мірна і рупліва рухацца ў будучыню, – разважае ён. – Год гістарычнай памяці – гэта зварот да нацыянальных каштоўнасцей, бо еднасць, адзінства, памяць звязаны з іншымі, не менш значнымі катэгорыямі, без якіх цяжка ўявіць цывілізаванага чалавека, – такімі як вера і годнасць.

Вяртанне да сваіх вытокаў і веры можа пачынацца і ў музеі, лічыць Барыс Лазука. А з другога боку, артэфакты становяцца бліжэй да людзей дзякуючы новым падыходам. Ужо неаднойчы, пачынаючы з 2017 года, іконы з музея старажытнабеларускай культуры экспанаваліся ў Вялікім тэатры Беларусі. У сакавіку тут у дзень, калі ішоў спектакль «Сівая легенда», дэманстравалі экспазіцыю з сямі рарытэтных абразоў Маці Божай – нябеснай заступніцы.

– Нам удаецца ствараць прастору, дзе пануе мастацтва без межаў, – тлумачыць дырэктар музея. – Як і опера «Сівая легенда», старажытныя цудатворныя абразы адпраўляюць нас у тагачасную гістарычную эпоху, захапляюць сваім незвычайным хараством.

Цяпер музейшчыкі «прыглядаюцца» да оперы «Дзікае паляванне караля Стаха». Лічаць, што незвычайную эмацыянальную афарбоўку і натхнёны настрой прыхільнікам opernага жанру перад спектаклем можа надаць выстава калекцыі слуцкіх паясоў.

А ікона Маці Божай Бялыніцкай летась пабывала ў Друі на выставе, прымеркаванай да 635-годдзя горада, а таксама ў Бялынічах і Магілёве. Насамрэч мясцовыя вернікі з нецярплівасцю чакалі, каб пабачыць святыню, да яе ішлі і прыязджалі адусюль. Сёлета ў Друі ў былым бернардынскім кляштары адкрылі выставу абразоў XVIII–XIX стагоддзяў, што знаходзяцца ў фондах музея старажытнабеларускай культуры. А гэта амаль паўсотні ікон са сваім няпростым і загадкавым, пранесеным праз вякі лёсам.

Кожная сустрэча з іканапіснымі рарытэтамі нясе нам цуд Божай ласкі і судакранання з высокім мастацтвам, з духоўнай спадчынай нашага народа.

*Сняжана МІХАЙЛОЎСКАЯ*

*Фота Аксаны МАНЧУК і з адкрытых крыніц*